# Газета гімназіі г. Дзяржынска
# “ЛАВІ МОМАНТ!”

сакавік, № 7

## ВЯСНОВЫ НАСТРОЙ

На календары вясна, а за акном і на душы – сцюжа? Сакавік – ён такі, сапраўды. Што ж рабіць? Самы час узяць сітуацыю ў свае рукі і літаральна выцягнуць сябе з зімы, стварыўшы **вясновы настрой**. Для гэтага неабходна:

- ✓ есці больш свежых і лёгкіх прадуктаў (салаты, фрукты, ёгурты, зялёны чай);
- ✓ слухаць лёгкую і свежую музыку (класіка, скрыпка, спевы птушак);
- ✓ змяніць карцінку на рабочым стале і на экране смартфона на вясновую;
- ✓ абнавіць гардэроб, дадаўшы малочных, блакітных, жоўтых і любых іншых светлых фарбаў;
- ✓ карыстацца парфумам з “вясновым” пахам;
- ✓ радавацца кожнаму дню, не крыўдзіць сваіх родных і блізкіх;
- ✓ ствараць прыгажосць сваімі рукамі;
- ✓ чытаць вясновы нумар газеты “Лаві момант” і набірацца пазітыву і вясновай энергіі!

*Кацярына Мінько, рэдактар газеты “Лаві момант”*

## ЧЫТАЙЦЕ Ў НУМАРЫ!


- пісьменнікі-юбіляры месяца
- віншаванне з 8 Сакавіка
- крыжаванка, прысвечаная мамам
- эсэ і вершы пра вясну
- 75 гадоў трагедыі ў Хатыні









## ПОЗДРАВЛЯЕМ!

*Восьмое марта — не напрасно*
*Его мы празднуем весной.*
*Ведь женщины всегда прекрасны,*
*Как солнце и цветок лесной.*

*Пусть аромат свой дарят розы,*
*Пусть будет много теплоты,*
*И будут только счастья слезы,*
*И все исполнятся мечты!*




## *Сакавіцкія воды*

***Люблю сакавіцкія воды –***
***Вірлівыя сокі вясны.***
***Як вены жывыя прыроды,***
***Зямлю напаўняюць яны.***
***Набракне зямля сакавіцай.***
***І раптам, парой маладой,***
***Снег, быццам гаючай жывіцай,***
***Рванецца на волю вадой.***
***І змыецца ўсё, што балела***
***Скаванаму целу зямлі.***
***Адродзяцца нанава смела,***
***Як першынец, глянуць палі.***
***А воды, вясеннія воды***
***Не змоўкнуць –***
***Свой знойдуць працяг:***
***Прыроды жаданыя роды***
***Узыдуць пралескай жыцця.***

***Ніна Аксёнчык***

# ЮБІЛЯРЫ МЕСЯЦА

195 лет



Александр Островский

150 лет



Максим Горький

70 гадоў



Генадзь Пашкоў

65 гадоў



Уладзімір Бутрамееў






















- ✓ Самый популярный российский драматург
- ✓ Был самым старшим из 14 детей в семье
- ✓ Был полиглотом, знатным рыболовом
- ✓ Не терпел критики
- ✓ Написал 47 пьес, в которых 728 действующих лиц
- ✓ Многие пьесы были экранизированы
- ✓ Умер на работе, при написании новой пьесы

Писателя так часто избивали в детстве, что, повзрослев, он почти не испытывал физической боли. В 1933 году в СССР был открыт Литературный институт, названный в честь Алексея Максимовича. За свою жизнь он был 5 раз номинирован на Нобелевскую премию по литературе.

Выдаў зборнік паэзіі «Кляновік» (1975), «Дыстанцыя небяспекі» (1979), «Гравюры дарог» (1981), «Зямлю слухаю» (1983), «Маналог на кастрышчы» (1986), «Крокі» (1988), «Люблю, спадзяюся, жыву» (1990), «Журавінавы востраў» (1998), «Тваім святлом благаслаўлёны» (2006). Выйшаў зборнік паэзіі для дзяцей «Дзяўчынка з блакітным мячыкам» (1986), «Пціч» (1991), «Зорнае поле» (1999), кнігі нарысаў «Будзень як свята» (1977), «Палескія вандроўнікі» (1998). З'яўляецца адным з аўтараў дакументальнага фільма «Я зямлю люблю так…».

Уладзімір Бутрамееў пачынаў шлях у літаратуру як празаік. Яго кнігі выходзілі ў Маскве на рускай мове. Аўтар зборніка прозы на **«Задарожжа».** Вядомасць У. Бутрамееву як драматургу прынёс спектакль на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы «Страсці па Аўдзею» (другая назва — «Крык на хутары», 1989).

# Трагедии в Хатыни - 75

Хатынь… Давным-давно это место было наполнено человеческими голосами, веселым смехом ребят и пением птиц. Теперь же там остались только скорбь, уныние и печаль. Хатынь превратилась в мемориальный комплекс, посвященный трагедии, которой исполняется в этом году 75 лет. Тогда, в далеком 43-ем году, фашисты собрали и загнали всех людей в один сарай, а после безжалостно сожгли. Хатынь – это напоминание людям, что надо жить в мире, согласии и никогда не давать место жестокости и насилию.

*Гринкевич Влада, 7 "М "класс*





# КРЫЖАВАНКА
# "І ЎСМІХНЕЦЦА ЛАСКАВА МАТУЛЯ"




**Усе словы ў крыжаванцы пачынаюцца з літары М.**

**Па гарызанталі:** 1. "… - галубка !-\\Просіць ён так міла,-\\Можа б ты на рэчку\\Пагуляць пусціла?". З верша Якуба Коласа "На рэчцы зімой". 4. Вялікі аматар музыкі і спеваў. 6. Калі … смяецца над кошкай, значыць паблізу ёсць нара (нігерыйская прык.). 7. Жонка прылашчыць, а … пашкадуе (прык.). 10. На губах - …, а на сэрцы – лёд(прык.). 11. "А … ты мой,\\Маё ты аздоб'е:\\Вочы рабы, як у жабы,\\Галава як доўбня". Прыпеўка . 15. … адмарозіць палец (прык.). 16. Мадэль, папярэдні ўзор. 17. Неглыбокае месца ў рэчцы. 18. "О, матчына … ! Маленства вясна!". З верша А.Бачылы "Матчына мова". 21. … міла, як галоўку мыла(прык.). . 22. Астаткі ад нафты пасля адгонкі з яе бензіну. 27. Старшы наборшчык друкарні, які вярстае набор старонкі. . 29. Партовае збудаванне. 30. Марская … . Мера даўжыні, роўная 1852 м. 31. Мацунак.32. … без жанчыны – галава без цела, жанчына без …- цела без галавы (нямецкая прык.). 33. Фата - … . Паводле падання, … - фея, якая жыве на марскім дне і ашуквае падарожнікаў прывіднымі зданямі.

**Па вертыкалі**: 2. Туман, смуга (перан.). 3.Тое, што і таможня. 5. Афіцэрскае званне. 7. Цвёрды камень крышталічнай пароды.8. Нешта фантастычнае, выдумка (перан.). 9. Сакавік з вадою, красавік з травою, а … з кветкамі (прык.). 12. У каго …, у таго і галоўка гладка (прык.). 13. "Біла мяне …\\Канапляным путам.\\- Не хадзі ты, дачушачка,\\З гэтым баламутам". Прыпеўка.14. Прыбор для рэгістрацыі калыхання ўзроўню вады ў моры, возеры, рацэ. 19. Хуткі парны танец лацінаамерыканскага паходжання. 20."За руку падтрымае тата,\\І ўсміхнецца ласкава …". З верша Аксаны Хацкевіч "Першае зерне". 23. Век зжыць – не … сшыць (прык.). 24. "Сам … за фурмана на ганку,\\У валёнкі цёплыя абуты"З верша дзяржынскага паэта Антона Анісовіча "Зіма". 25. "Пасеяў дзед грэчку, баба кажа: -…!\\- Ой, ой, жонка мая, няхай будзе воля твая!". З беларускай народнай песні "Пасеяў дзед грэчку". 26. Аматар зімовага плавання ў адкрытых вадаёмах. 28. Выраз твару.

Падрыхтаваў Лявон Целеш

# МЫСЛИ ВСЛУХ

*Весна…Чудесное время года, отдых от холодной зимы. Само слово “весна” вызывает у меня приятные чувства и воспоминания. Солнечная погода, пение птиц и радость от долгожданного тепла. Повсюду тает снег, светлеют участки зеленой травы. В воздухе запах цветов. Также слово “весна” у меня ассоциируется с праздником 8 Марта и в целом с девушками. Такая же нежная, заботливая, ласковая, солнечная. Весна – праздник в наших душах, праздник любви, заботы, ласки, света. И пусть всегда весна прогоняет зиму, как утро ночь. Пусть всегда в наших сердцах останется место для любви и красоты.*



*Екатерина Шинкевич, 7 “Б” класс*






*Тихо и незаметно подкрадывается вечер. Смолкает щебет птиц, и приходит время сверчков и цикад. Вот загораются первые звезды на небе. А ты сидишь на лавочке и мечтательно смотришь на них, вспоминая лучшие моменты из своей жизни. В моём понимании это весна. Это то время, когда все живое пробуждается ото сна и наступает она. Необыкновенная, чудесная и нежная весна, которая дарит лишь радость и гармонию. Именно в эту пору года к нам и приходит праздник 8 Марта. Праздник женщин. Ведь каждая их них так похожа на весну своим обаянием, лаской и бесконечно светлой улыбкой на радостном лице.*






*Владислава Гринкевич, 7 «М» класс*






## Адказы на крыжаванку с. 3:

Па гарызанталі: 1. Мамачка. 4. Меламан. 6. Мыш. 7. Маці. 10. Мёд. 11. Мілёначак. 15. Марац. 16. Макет. 17. Мель. 18. Мова. 21. Мамка. 22. Мазут. 27. Метранпаж. 29. Мол. 30. Міля. 31. Моц. 32. Мужчына 33. Маргана.

Па вертыкалі: 2. Муць. 3. Мытня. 5. Маёр. 7. Мармур. 8. Міф. 9. Май. 12. Матка. 13. Матулечка. 14. Марэограф. 19. Мамба. 20. Матуля. 23. Мех. 24. Мароз. 25. Мак. 26. Морж. 28. Міна

Газета “Гімназіі г. Дзяржынска”
“ЛАВІ МОМАНТ”
№ 7, сакавік 2018 г.
Выходзіць 1 раз на месяц
Наш адрас:
Мінская вобласць, г. Дзяржынск,
вул. 1-ая Ленінская, 21
gymnasium@schoolnet.by
Галоўны рэдактар газеты:
кіраўнік аб’яднання па інтарэсах “Юны журналіст”
Мінько Кацярына Аляксандраўна